Пролетары ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 72 (141)
ЧАЦВЕР
28
САКАВІКА
1940 г.

Цана 10 капеек

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ДЭПУТАТ—СЛУГА НАРОДА

Закончаны выбары дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Падведзены вынікі ўсенароднага галасавання. Усюды дэпутатамі выбраны кандыдаты Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. У вярхоўныя органы ўлады вызвалены народ паслаў рабочых і работніц, сялян і сялянак, лепшых прадстаўнікоў інтэлігенцыі.

Выступаючы на перадвыбарчых сходах перад сваімі выбаршчыкамі, кандыдаты ў дэпутаты абяцалі быць да канца адданымі народу, абараняць яго інтарэсы, быць вернымі партыі Леніна—Сталіна, прысвяціць усё сваё жыццё будаўніцтву комуністычнага грамадства, быць бязлітаснымі да ворагаў народа.

Гэтыя абяцанні дэпутаты будуць свята выконваць, бо яны з'яўляюцца плоць ад плоці народа. У выбраных дэпутатаў не можа быць іншых інтарэсаў, чым інтарэсы народа. Але не толькі таму. Сталінская Канстытуцыя правяла такі закон, у сілу якога дэпутат залежны ад сваіх выбаршчыкаў і пасля выбараў. «Дэпутат павінен ведаць, што ён слуга народа, яго пасланец у Вярхоўны Совет і ён павінен весці сябе па лініі, па якой яму дан наказ народам». (Сталін). І далей: «...выбаршчыкі маюць права датэрмінова адклікаць сваіх дэпутатаў, калі яны пачынаюць фінціць, калі яны зварочваюць з дарогі, калі яны забываюць аб сваёй залежнасці ад народа, ад выбаршчыкаў», (Сталін).

Гэта выдатны закон. Нічога падобнага няма ў капіталістычных краінах. Там дэпутаты часткова залежны ад народных мас толькі да выбараў. Мы гаворым часткова, таму што дэпутаты насільна навязваюцца народным масам, і ўсякімі законамі і беззаконнямі яны прабіваюцца да кіравання дзяржавай. Да выбараў буржуазнаму дэпутату нічога не варта абяцаць масам палепшыць іх становішча, абараніць іх інтарэсы і т. д. Гэтыя дэкларацыйныя прамовы разлічаны на тое, каб абмануць адсталую частку выбаршчыкаў і прыцягнуць на свой бок больш галасоў. Хіба мала абяцалі народным масам былой Польшчы ўсе гэтыя масціцкія, бекі і рыдз-сміглы? А што з гэтага атрымлівалася? Становішча рабочага класа і сялянства пагаршалася. З кожнымі новымі выбарамі, з кожным годам лютаваў соцыяльны і нацыянальны прыгнёт. Турмы былі перапоўнены лепшымі прадстаўнікамі народа. Увязаўшы краіну ў злапалучную вайну, гэтыя «народныя выбраннікі» пакінулі свой народ на волю лёсу і, захапіўшы народнае золата, ганебна ўцяклі за граніцу.

Буржуазны дэпутат пасля яго выбрання зусім незалежны ад народных мас. Ён спакойна можа не выконваць ім-жа абяцанага ў перадвыбарчых прамовах. Да новых выбараў, гэта значыць на працягу 4—5 год, выбаршчыкі не могуць аказаць уплыў на свайго дэпутата. Ён перад імі не дае справаздачы. Не могуць яны адклікаць дэпутата і на яго месца выбраць другога. Буржуазны дэпутат, гаворыць таварыш Сталін, «можа перайсці з аднаго лагера ў другі, ён можа звярнуць з правільнай дарогі на няправільную, ён можа нават заблытацца ў некаторых махінацыях не зусім патрэбнага характару, ён можа куляцца як яму ўгодна,—ён незалежны».

Такая розніца паміж дэпутатамі совецкага парламента і дэпутатамі буржуазных парламентаў. Буржуазны дэпутат безадказны перад народам; совецкі дэпутат—поўнасцю адказны перад народам, поўнасцю залежыць ад народа, з'яўляецца слугой народа.

Дэпутаты совецкага парламента ад заходніх абласцей прыступілі да выканання сваіх дэпутацкіх абавязкаў. Кожны выбаршчык мае права звярнуцца да свайго дэпутата з любым пытаннем і ён атрымае поўны і вычарпальны адказ. Дэпутаты павінны дапамагчы выбаршчыкам у адкрыцці новых школ, бальніц, у наладжванні совецкага гандлю, у выкараненні бюракратызма, цяганіны і бяздушша да жывых людзей, да іх запатрабаванняў, у ліквідацыі фактаў парушэння рэвалюцыйнай законнасці.

Выбраныя дэпутаты ў Вярхоўныя Советы СССР выехалі ў Маскву на VI Сесію Вярхоўнага Совета СССР. На гэтай Сесіі будуць вырашацца важнейшыя дзяржаўныя пытанні. Па прыездзе назад дэпутаты будуць аддаваць справаздачу перад выбаршчыкамі аб рабоце і рашэннях Сесіі. Да гэтых першых справаздач дэпутатаў перад выбаршчыкамі трэба дзейна рыхтавацца. Гэтыя справаздачы павінны праслухаць як можна больш выбаршчыкаў, якія павінны быць у курсе спраў усіх *рашэнняў* совецкага парламента. Гэта толькі адна з форм сувязі дэпутатаў з выбаршчыкамі. Гэта сувязь павінна быць сістэматычнай, каб выбаршчык мог кантраліраваць работу свайго дэпутата.

Выбаршчыкі,—гаворыць таварыш Сталін,—«павінны патрабаваць ад сваіх дэпутатаў... каб яны былі такімі-ж яснымі і акрэсленымі дзеячамі, як Ленін, каб яны былі такімі-ж бясстрашнымі ў баі і бязлітаснымі да ворагаў народа, якім быў Ленін...,каб яны былі таксама-ж мудрыя і непаспешлівыя пры вырашэнні складаных пытанняў, дзе патрэбна ўсебаковая арыентацыя і ўсебаковы ўлік усіх плюсаў і мінусаў, якім быў Ленін, каб яны былі таксама-ж праўдзівыя і чэсныя, якім быў Ленін, каб яны таксама-ж любілі свой народ, як любіў яго Ленін». Вось вобраз совецкага дэпутата, нарысованы вялікім Сталіным.

Быць дзеячом ленінска-сталінскага тыпу, ва ўсім ісці па ўказаннях Леніна і Сталіна, указаннях вялікай і непераможнай партыі большэвікоў—такі наказ выбаршчыкаў сваім дэпутатам.

Няма ніякага сумнення, што дэпутаты з чэсцю апраўдаюць гэта вялікае давер'е свайго народа.

—«о»—

УРУЧЭННЕ ОРДЭНАЎ І МЕДАЛЕЙ САЮЗА ССР

27 сакавіка Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР таварыш М. І. Калінін уручыў ордэны і медалі ўзнагароджаным.

Грамата аб прысваенні звання Героя Совецкага Саюза, ордэн Леніна і медаль «Золотая звезда» уручаюцца капітану тав. **В. А. Капцову,** малодшым камандзірам тт. **Лазараву** і **В. С. Слабадзяну** і старшаму лейтэнанту тав. **Ф. Я. Спехаву,** узнагароджаным за ўзорнае выкананне баявых заданняў Урада і праяўленае пры гэтым геройства.


Узнагароды за ўзорнае выкананне баявых заданняў Урада і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць атрымліваюць капітан тав. **Ф. А. Барчанінаў,** старшы лейтэнант тав. **В. А. Зубакін,** малодшы камандзір тав. **Е. П. Касторны** і чырвонаармеец тав. **А. І. Паяркаў.**

Ордэны за ўзорнае выкананне баявых заданняў Камандавання на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць уручаюцца маёру тав. І. Н. **Кавашуку** і палкавому камісару таварышу **Р. П. Байчуку.**

Медалей ордэны і медалі ўручаюцца асаба вызначыўшымся настаўнікам сельскіх школ, узнагароджаным за выдатныя поспехі ў справе школьнага навучання і совецкага выхавання дзяцей у сельскіх школах, за выдатную пастаноўку вучэбнай работы і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ў вёсцы. Сярод іх — настаўніца Арцёмаўскай сярэдняй школы, Арцёмаўскага раёна, Краснаярскага края, тав. **А. П. Сурова;** настаўніца Міхееўскай пачатковай школы, Паўночнага раёна, Новасібскай вобласці, тав. **Н. А. Шыманскі** і настаўнік Княшчынскай сярэдняй школы, Вышневалоцкага раёна, Калінінскай вобласці, тав. **В. І. Вінаградаў.**

Ордэны і медалі атрымліваюць і інш. заслужаныя і гаспадарчыя работнікі.

Пасля ўручэння ўзнагарод таварыш **М. Калінін** павіншаваў узнагароджаных таварышоў і пажадаў ім поспеху ў далейшай рабоце. **(ТАСС).**



24 сакавіка ў дзень выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.
На здымку: 80-гадовы старык Эйнер са сваёй жонкай адным з першых галасаваў за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных на 76 участку Совецкай выбарчай акругі. (Фота Сапір)

УКАЗ
ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР
Аб узнагароджанні работнікаў радыёвяшчання БССР у сувязі з 15-годдзем совецкага радыёвяшчання

У азнаменаванне 15-годдзя совецкага радыёвяшчання, за паспяховую работу ў справе развіцця радыёвяшчання ў БССР узнагародзіць:

ПАЧОТНАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

1. **Бастокава** Нікалая Нікалаевіча — саліста радыёкамітэта.
2. **Гітліц** Вульфа Мордухавіча — піяніста канцэртмейстэра радыёкамітэта.
3. **Екельчыка** Майсея Лазаравіча—старшыню радыёкамітэта БССР.
4. **Кабакова** Самуіла Мендэлевіча — рэдактара аддзела прапаганды і агітацыі радыёкамітэта.
5. **Ржэўскую** Тамару Аўгустаўну — загадчыка аддзелам прэсы.
6. **Руч'ёву** Лідзію Вячэславаўну— салістку радыёкамітэта.
7. **Старыкова** Івана Аляксандравіча — рэдактара радыёвяшчання Аршанскага раёна.

ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

1. **Бедынермана** Ідэля Давідавіча— рэдактара радыёвяшчання Пінскага раёна.
2. **Бартноўскага** Генрыха Аляксандравіча — актыўнага радыёаматара, канструктара Дома тэхнікі.
3. **Батвінік** Любоў Яўсееўну — старшага дыктара.
4. **Батвініка** Подзіка Ісакавіча — рэдактара літаратурна-драматычнага вяшчання.
5. **Карамзінаву** Валенціну Фёдараўну — рэдактара дзіцячага вяшчання.
6. **Лавант** Лею Майсееўну — загадчыка бюро інфармацый.
7. **Лабанава** Георгія Філіпавіча— канцэртмейстэра аркестра народных інструментаў.
8. **Перцоўскага** Давіда Мендэлевіча — намесніка старшыні Магілеўскага абласнога радыёкамітэта.
9. **Семашкіна** Еўціхія Грыгор'евіча — рэдактара радыёвяшчання Баранавіцкага абласнога радыёкамітэта.
10. **Салаўёва** Васілія Андрэевіча — начальніка аддзела механічнага вяшчання.
11. **Фраймана** Абрама Зіселевіча — старшыню Баранавіцкага абласнога радыёкамітэта.
12. **Шарава** Канстанціна Васільевіча — тэхніка механічнага вяшчання.
13. **Шофер** Сару Ізраілеўну — старшага дзяжурнага па радыёвяшчанню.
14. **Эпштэйн** Міру Абрамаўну — салістку хора радыёкамітэта.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Л. ПАПКОЎ.

22 сакавіка 1940 г.
г. Мінск.

СЯЛЯНЕ ДЗЕЙНА РЫХТУЮЦЦА ДА ПЕРШАЙ СОВЕЦКАЙ ВЯСНЫ

У КАЛГАСЕ ПЕРАД ПАСЯЎНОЙ

Мерна дыша кузнечны мех. Роем уздымаюцца іскры. Па ўсёй вёсцы Ліхасельцы з ранку да вечара разносіцца стук малаткоў. Звініць накавальня. Гэта кавалі калгаса імені 22 гадавіны Чырвонай Арміі тт. Харкевіч Павел і Гаромчык Пётр рамантуюць сельскагаспадарчы інвентар. Ад праўлення калгаса яны атрымалі заданне не пазней 1-га красавіка закончыць рамонт сельскагаспадарчага інвентару. Заданне паспяхова выконваецца. З першых дзён работы вакол кузні было многа награмаджана плугоў, барон, калёс. 20 сакавіка большасць інвентару ў спраўным выглядзе адпраўлена на калгасны двор. Зараз работа па рамонту сельгасінвентару падыходзіць к канцу.

Дзейна рыхтуюцца да сяўбы ўсе калгаснікі. Ссыпана 128 цэнтнераў аўсу, $8\frac{1}{2}$ цэнтнераў пшаніцы і ячменю. Зараз гэта насенне ачышчаецца і правяраецца па ўсхожасць.

— Плошча калгаснай зямлі,— гаворыць старшыня калгаса тав. Калюта, — значна пашырылася ў параўнанні з той, што была ў карыстанні нашай вёскі. Мы атрымалі 340 гектараў зямлі, якая раней належала асаднікам.

Добра арганізован догляд абагуленай жывёлы. У калгасе налічваецца 20 дойных кароў, 2 племянных быкі, 5 цёлак, 35 авец, 18 свіней і 1 племянны кныр. Аддана працуюць даглядчыкі жывёлы. Загадчыкам фермы вылучан калгаснік тав. Баярчук. Ён штодзённа сочыць, каб калгасная жывёла своечасова і добра была накормлена. Асаблівую ўвагу ён аддае догляду і захаванню маладняка. Прыкладна працуюць на ферме даглядчыцы-дзяўчаты Марыя і Вера Бычок.

Д. Казлоў

Свіслацкі раён.

ПАСЕЕМ ДОБРАЯКАСНЫМ ЗЯРНОМ

Доўгія годы селянін марыў аб зямлі. Ён змагаўся за зямлю, змагаўся за кусок хлеба, за тое, каб не памерці з голаду. Народны здабытак — зямля належала памешчыкам. Сапраўдныя гаспадары зямлі, тыя, каму па праву яна належыла, мелі вузенькія палоскі самай горшай, неўрадлівай зямлі.

Так жылі многія сяляне вёскі Цярэшкі, Валкавыскага раёна. Фёдар Навумовіч не меў зусім зямлі. У яго з галавы не выходзіла думка пра тое, каб хоць адзін гектар мець сваёй зямлі.

З прыходам Чырвонай Арміі яму далі 5 гектараў зямлі. 118 батракоў, працаваўшых у маёнтку Кабылякі, усё сваё жыццё таксама марылі аб зямлі. Толькі совецкая ўлада надзяліла іх зямлёй. 459 гектараў зямлі былога маёнтка Кабылякі раздана беззямельным, малазямельным і батракам. Батракі атрымалі не толькі зямлю, але і неабходны інвентар для апрацоўкі яе, а таксама зярно для пасеву.

Былыя батракі, стаўшыя сапраўднымі гаспадарамі зямлі, рыхтуюцца да першай совецкай вясны. Яны закончылі ўжо малацьбу. Арганізавана і дружна праходзіць ачыстка насення.

— Сяўбу мы правядзём своечасова і высокаякасным зярном, — заяўляюць былыя батракі.

Нямала цярпелі ад беззямелля сяляне вёскі Вярэйкі. Памешчыкі валодалі лепшымі землямі, лясамі. Зараз гэтай зямлёй карыстаюцца вярэйкаўцы. У вёсцы арганізован калгас. Калгасу адведзена 129 гектараў былой памешчыцкай зямлі. Усяго абагуленай зямлі ў калгасе налічваецца 520 гектараў.

Калгаснікі дружна рыхтуюцца да выезду ў поле. У калгаснікаў адно жаданне—узорна правесці першую большэвіцкую сяўбу, каб дабіцца высокага ўраджаю.

Праўленне калгаса ставіць перад сабой задачу — засеяць кожны гектар толькі добраякасным, ачышчаным зярном. У калгасе арганізована ачыстка насення. Прыводзіцца ў парадак сельгасінвентар, калёсы, збруя.

С. Грышчук.

ПА СОВЕЦКАМУ САЮЗУ

ВЫТВОРЧЫЯ ПАДАРУНКІ

МАГНІТАГОРСК, 27 сакавіка. (ТАСС). Перадавая металургія Магнітагорскага камбіната імені Сталіна сустракаюць VI Сесію Вярхоўнага Совета СССР вытворчымі падарункамі. 26 сакавіка пракатчыкі далі звыш сутачнага задання 1.100 тон металу.

* * *


ВАРАШЫЛАЎГРАД, 27 сакавіка. (ТАСС). 25 сакавіка закончылі квартальны план вугледабычы шахты 7-біс трэста «Бокаўантрацыт» і імені Варашылава трэста «Варашылаўвугаль». Па камбінату «Варашылаўградвугаль» 12 шахт выдаюць вугаль звыш квартальнага плана.

*

КОМСАМОЛЬСК-на-АМУРЫ, 27 сакавіка. (ТАСС). Рыбалавецкія калгасы сярэдняга Амура закончылі квартальны план падлёднага лову рыбы. Па-стаханаўску працавалі брыгады нанайскага калгаса імені Сталіна (паселішча Ніжні Экань). Квартальнае заданне яны выканалі на 734 проценты.

НА БУДАЎНІЦТВЕ ПАЎНОЧНА-ФЕРГАНСКАГА КАНАЛА

ФЕРГАНА, 27 сакавіка. (ТАСС). Калгаснікі Ферганскай даліны закончылі земляныя работы на трасе Паўночна-Ферганскага канала. Усяго вынята 2.531 тысяча кубаметры грунту пры плане 2.[illegible] тысячы кубаметраў.



На здымку: Новы будынак лесатэхнічнага інстытута ў гор. Краснаярску. (Фота-клішэ ТАСС).

САМАЛЁТ ВАДАП'ЯНАВА Ў АМДЭРМЕ

БОРТ САМАЛЁТА «СССР Н-170», 27 сакавіка. (Спец. кар. ТАСС). Чатырохматорны карабль, пілатыруемы Героем Совецкага Саюза тав. М. В. Вадап'янавым, пераляцеў з Нар'ян-Мара ў Амдэрму. Надвор'е спрыяла палёту. Толькі месцамі паветраны шлях пралягаў над туманам, які пакрыў заснежаную тундру. Ля Нар'ян-Мара нам сустрэўся самалёт Орлова «СССР Н-171», які вяртаўся з вострава Рудольфа ў Маскву.

Жыхароў Амдэрмы ўжо не здзівіш самалётам. Лётчыкі сталі тут частымі гасцямі. Тым не менш сустракаюць тут усіх радасна. Цёплы прыём аказан у Амдэрме нам.

Затрымаемся тут, як відаць, нядоўга. Карыстаючыся добрым надвор'ем, тав. Вадап'янаў павядзе машыну ўзбярэжжам Ледавітага акіяна далей на ўсход — на Чукотку.

ЦЯГУНІН.

ВЫКАНАЛІ ДАТЭРМІНОВА КВАРТАЛЬНЫЯ ПЛАНЫ

КАНСТАНЦІНАЎКА (Сталінская вобласць). Суперфасфатны цэх хімічнага завода выканаў вытворчы план першага квартала. На агульным сходзе калектыў цэха абавязаўся да дня адкрыцця VI сесіі Вярхоўнага Совета СССР даць соцыялістычным палям 13 тысяч тон мінеральных угнаенняў звыш плана

* * *

ІРКУЦК. Гарнякі Крапоткінскага ўпраўлення Лены датэрмінова завяршылі квартальны план здабычы золата. Заданне па прадукцыйнасці працы выканана забойшчыкамі на 160.5 процанта.

* * *

ВАРАШЫЛАЎГРАД. Гарнякі шахты № 16-біс імені «Известий» трэста «Данбас-антрацыт» датэрмінова закончылі квартальны план здабычы вугалю. Да адкрыцця VI Сесіі Вярхоўнага Совета СССР калектыў шахты рашыў выдаць на-гара звыш плана 12 тысяч тон антрацыту.

БУЙНАЕ ВАДАСХОВІШЧА

КРАСНАДАР. У першых чыслах мая ў Краснадарскім краі пачнецца збудаванне Тшыкскага вадасховішча. Плошча яго 87,5 тысячы гектараў, ёмкасць — 400 мільёнаў кубаметраў вады. Стварэнне вадасховішча дасць магчымасць агарадзіць ад затаплення да 650 тысяч гектараў зямель у нізоўях ракі Кубані.

ТАРЖАСТВО БЕЛАРУСКАГА ВЫЗВАЛЕНАГА НАРОДА

П. К. ПАНАМАРЭНКА
Сакратар ЦК КП(б) Беларусі.

Толькі шэсць месяцаў прайшло з таго часу, калі доблесная Рабоча - Сялянская Чырвоная Армія вызваліла Заходнюю Беларусь ад прыгнятальнікаў. Толькі пяць месяцаў прайшло з часу незабыўных дзён Народнага Сабрання, выразіўшага адзіную волю народа Заходняй Беларусі аб устанаўленні совецкай улады і з'еднанні беларускага народа ў адзінай Беларускай дзяржаве, у саставе вялікага Совецкага Саюза.

Які кароткі тэрмін, а якія велізарныя змены адбыліся ў эканоміцы, культуры, быту народа! Згодна волі Народнага Сабрання зямля знаходзіцца ў руках тых, хто на ёй працуе,—у сялян. Фабрыкі, заводы і банкі сталі грамадскім здабыткам. У органах улады — советах, у сялянскіх камітэтах знаходзяцца прадстаўнікі народа.

Ва ўсіх кутках заходніх абласцей Беларусі кіпіць велізарная творчая работа. 20 тысяч працоўных, паказваючы ўзоры стаханаўскай працы, будуюць Днепра - Бугскі канал, рэканструіруючы важнейшую водную магістраль. Многатысячная армія будаўнікоў прыступае да аднаўлення другой воднай магістралі—Днепра-Нёманскага (Агінскага) канала. Рабочыя ў горадзе Гродна рэканструіруюць веласіпедны завод, імкнучыся давесці выпрацоўку да 50 тыс. веласіпедаў у год. Запалкавая фабрыка ў Пінску дае 1.500 скрыняў запалак штодзённа. Аднаўляюцца заводы сельгасмашын у Ломжы і Лідзе. Ужо ў гэтым годзе яны выпусцяць 2,5 тыс. малатарань, каля 1.000 веялак, 13 тыс. саламарэзак, 1000 ільнотрапалак. У бліжэйшы час уступіць у строй цэлы рад новых прадпрыемстваў. Расшыраецца абутковая фабрыка, былая «Ардаль», у Лідзе. Фабрыка ў гэтым годзе выпусціць вялікую колькасць featureнага абутку і 540 тыс. пар галош. Аднаўляюцца тэкстыльныя фабрыкі ў Беластоку. Лік рабочых-тэкстыльшчыкаў павялічыўся на 4 тыс. чалавек.

Расце і шырыцца стаханаўскі рух, ламаючы старыя погляды на працу. Беластоцкія тэкстыльшчыкі высунулі лозунг зрабіць совецкі Беласток другім Іванавым. Ужо ў гэтым годзе рэканструіраваныя фабрыкі Беластока выпусцяць каля 10 мільёнаў метраў высокаякаснай тканіны. Ажыла лясная прамысловасць, якая ўжо ў гэтым годзе дасць 4.100 тысяч кубаметраў драўніны. Пачалі працаваць раней закансерваваныя фанерныя заводы, арганізуецца лесахімічная прамысловасць, разгорнута будаўніцтва буйнага папярова - целюлознага камбіната.


Заходнія абласці Беларусі маюць ужо ў 1940 г. свой першы народнагаспадарчы план, які з'яўляецца ілюстрацыяй велізарных клопатаў партыі Леніна — Сталіна аб краі, аб беларускім народзе. Гэты план, апрача сказанага вышэй, прадугледжвае аднаўленне разбураных бамбардыроўкай гарадоў, будаўніцтва школ, рэканструкцыю вадаправодных і каналізацыйных сетак, поўнае аднаўленне і расшырэнне тэлефоннай і тэлеграфнай сувязі, расшырэнне электрастанцый у Беластоку, Гродна, Брэсце і іншых.

Сотні тысяч беззямельных і малазямельных сялянскіх гаспадарак атрымалі зямлю, раней належаўшую польскім магнатам і памешчыкам Радзівілам, Сапегам, Тышкевічам і іншым. Сотні тысяч гектараў ворыўнай зямлі атрымалі былыя батракі, беднякі і малазямельныя серадняки, не лічачы выпасаў і сенажатных угоддзяў. Звыш 25 тысяч бескароўных і 10 тыс. гаспадарак, якія не мелі коней, надзелены каровамі і коньмі. У дапамогу сялянам накіроўваюцца аграномы, тэхнікі, ствараюцца кузьні для рамонту сельскагаспадарчага інвентара.

Сяляне заходніх абласцей Беларусі актыўна рыхтуюцца да першай совецкай вясны, ачышчаюць насенне і рыхтуюць сельскагаспадарчы інвентар і збрую, вывозяць гной на палі, дагаварваюцца аб узаемнай дапамозе ў ворыве, аб узаемнай дапамозе насеннем. У сёлах арганізавана каля 1.000 зернаачышчальных пунктаў і перасовачных абозаў для ачысткі насення. Да веснавой сяўбы ў сёлы заходніх абласцей рэспублікі завозіцца многа сельскагаспадарчага інвентару: звыш 2.000 конных плугоў, 1.600 культыватараў, каля тысячы сеялак, сенакасілак, жнярак і т. д.

Велізарную палітычную актыўнасць сялян характарызуе жаданне многіх з іх арганізаваць калектыўныя гаспадаркі. Найбольш перадавыя сяляне, беднякі і серадняки, глыбока разумеючы шляхі соцыялістычнага будаўніцтва ў вёсцы, вучачыся на прыкладзе вялікага Совецкага Саюза, выступаюць застрэльшчыкамі стварэння калгасаў і ствараюць іх. У некаторых выпадках заявы з просьбай арганізаваць калгасы сяляне падаюць цэлымі вёскамі. У Мастоўскім раёне, Баранавіцкай вобласці, у вёсцы Курылавічы з 104 гаспадарак, пражываючых у вёсцы, заявы аб уступленні ў калгас падалі 95 гаспадарак. У вёсцы Вайнілавічы, гэтага-ж раёна, з 102 гаспадарак — 98. У вёсцы Чудзіна, Ганцэвіцкага раёна, Пінскай вобласці, з 319 гаспадарак у калгас уступілі 293. У Пружанскім раёне, Брэсцкай вобласці, з 9.000 гаспадарак 2428 падалі заявы аб уступленні ў калгасы. Да сучаснага моманту ў заходніх абласцях арганізавана 149 калгасаў, еднаючых 9.856 гаспадарак.

Сяляне надзвычай сур'ёзна падыходзяць да арганізацыі калгасаў. Як правіла, пасля рашэння схода сяляне зараз-жа прыступаюць да аграмаджання цяглавай сілы, насення, сельскагаспадарчага інвентару. Партыйныя і совецкія арганізацыі аказваюць вялікую дапамогу калгаснаму будаўніцтву, назіраючы за строгім захаваннем прынцыпа дабраахвотнасці і не дапускаючы ў гэтай справе спешкі і адміністрыравання.



У дапамогу ўноў арганізуючымся калгасам і працоўным сялянскім гаспадаркам у раёнах заходніх абласцей БССР ствараюцца машынна-трактарныя станцыі і машынна-трактарныя майстэрні. Партыйныя і совецкія арганізацыі, улічваючы велізарнае жаданне сялянскай моладзі заходніх абласцей набыць спецыяльнасці трактарыстаў і механізатараў, арганізавалі сець курсаў, на якіх навучаецца звыш 1.400 чалавек. Намечана ў бягучым годзе падрыхтаваць 3.500 трактарыстаў.

Беларусы ў Польшчы не мелі нават пачатковых школ на роднай мове. Становішча моладзі было бесперспектыўным. Яна не мела доступу ні ў школы, ні на прадпрыемствы, ні ва ўстановы. Галеча і непісьменнасць былі яе лёсам. Яна сама сябе іменавала «трагічным пакаленнем Польшчы».

Зараз у заходніх абласцях створаны 4 вузы і 8 педагагічных вучылішч. Школ, у якіх выкладанне вядзецца на роднай мове, зараз налічваецца звыш 4.000. У Заходняй Беларусі не было ні аднаго тэатра, зараз там працуюць 7 тэатраў. У горадзе Гродна, не меўшым ні аднаго тэатра, будуць 2 тэатры — рускі драматычны і лялькавы. У Беластоку — філармонія, сімфанічны аркестр, ансамбль народнай песні і пляскі, эстрадны ансамбль, тэатр мініятур, яўрэйскі і польскі. Адкрыты дамы мастакоў у Брэсце і Беластоку, пяць абласных дамоў народнай творчасці. Музей выяўленчага мастацтва. Адкрываюцца 8 музыкальных школ, 2 музыкальных вучылішчы і 1 мастацкае вучылішча. Створаны сотні больнічных, курортна-санаторных устаноў і т. д.

Самая цяжкая спадчына капіталістычнага рабства—беспрацоўе ў асноўным ліквідавана. Зараз, калі ёсць некаторая колькасць непрацуючых, дык гэта з ліку паразітычных элементаў, якія ніколі не працавалі, ненавідзяць працу і жывуць яшчэ накопленым тлушчам.

Сказаным вышэй далёка не вычэрпваюцца ўсе тыя велізарныя змены і той размах творчай работы, якія назіраюцца ў заходніх абласцях БССР.

Выступленні працоўных на прадвыбарчых сходах і гутаркі ў гуртках сведчаць аб велізарнай любві і давер'і да комуністычнай партыі, совецкай улады, да правадыра народаў таварыша Сталіна.

Асабліва радасныя і хвалюючыя дні перажываюць працоўныя заходніх абласцей БССР у сучасны момант. 24 сакавіка раскрыюцца дзверы ўсіх выбарчых участкаў гарадоў, мястэчак і сёл. Працоўныя будуць выбіраць сваіх лепшых сыноў і дачок у Вярхоўны Совет СССР і Вярхоўны Совет БССР. Вызвалены народ вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты соцыялістычнага парламента дастойнейшых з дастойных, лепшых сваіх сыноў і дачок, праверaных у жорсткай барацьбе з памешчыкамі і капіталістамі, правераных у выдатных буднях крапатлівай работы і ў дні ўстанаўлення і ўмацавання совецкай улады.

Мужныя рэвалюцыянеры — батрак Прытыцкі і паэт Пестрак, селянін Стома і інжынер Турлейскі, селянін-бядняк Клявец і работніца-тэкстыльшчыца Дзьячук і многа іншых выдатных людзей, даказаўшых на справе сваю глыбокую адданасць справе Леніна—Сталіна, справе народа, вылучаны кандыдатамі соцыялістычнага парламента.

«Сталін — наш сцяг, Сталін—наша сіла, Сталін — наша гордасць і радасць, ён вывеў нас на свабодную дарогу, асвечаную праменнямі Сталінскай Канстытуцыі»,—так сказаў на перадвыбарным сходзе стрэлачнік Уладзімір Якабюк, так гавораць звыш 4 мільёнаў вызваленых людзей, стаўшых гаспадарамі свайго жыцця.

У час выбараў у польскі сейм у 1938 г. ад выбарчай акругі з польскім насельніцтвам выбіраўся адзін дэпутат ад 48 тыс. выбаршчыкаў, а ў так званыя ўсходнія крэсы пасылалі 1 дэпутата ад 213 тысяч выбаршчыкаў. Адзін голас выбаршчыка-паляка быў роўны 4,5 голаса беларусаў.

Зараз на совецкай зямлі ўсе нацыянальнасці роўны, усе карыстаюцца аднолькавым правам, усе маюць аднолькавыя правы выбіраць і быць выбранымі, маюць права на працу, на адпачынак, на асвету, на шчасце, на ўсё тое, чаго дабіўся совецкі народ і што запісана ў Сталінскай Канстытуцыі.

У працэсе стварэння органаў совецкай улады і ў ходзе выбарчай кампаніі, у ходзе соцыялістычнага будаўніцтва да актыўнага палітычнага жыцця, да ўдзелу ў дзяржаўным і гаспадарчым будаўніцтве падымаюцца велізарныя слаі рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі. Вызвалены народ вылучыў тысячы таленавіцейшых прадстаўнікоў да кіраўніцтва дзяржавай, у яе органы і розныя арганізацыі. Батрак Прытыцкі, чые гарачыя словы слухала ўнечарговая V Сесія Вярхоўнага Совета СССР, зараз працуе намеснікам старшыні Беластоцкага аблвыканкома; член паўнамоцнай камісіі Марыя Дзьячук загадвае аддзелам аблвыканкома; рабочы Саўчук вылучан старшынёй Брэсцкага гарадскога выканаўчага камітэта; дэпутат Народнага Сабрання рабочы Гнядэк вылучан намеснікам старшыні Беластоцкага горсовета; член паўнамоцнай камісіі тав. Стома вылучан на кіруючую работу ў Вілейскі абласны зямельны аддзел. Тысячы іншых прадстаўнікоў народа вылучаны на кіруючую работу — дырэктарамі заводаў, начальнікамі аддзелаў, цэхаў і т. д.

Комуністычная партыя заваявала бязмежны аўтарытэт у новых грамадзян Совецкага Саюза — працоўных заходніх абласцей Беларусі. Гэтае бязмежнае давер'е і з'яўляецца несакрушымай сілай сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Вялікая перабудова пачалася. Парасткі новага пераканаўчы і адчувальны. Выбарчая кампанія ў заходніх абласцях ператварылася ў своеасаблівы агляд дасягненняў вызваленага народа.

Выбары яшчэ больш умацуюць сталінскі блок комуністаў і беспартыйных і прадэманстрыруюць новую бліскучую перамогу.

Будаўніцтва новага жыцця ў заходніх абласцях БССР згуртоўвае працоўныя масы вакол партыі Леніна—Сталіна, мабілізуе іх на павышэнне рэволюцыйнай пільнасці, на канчатковы разгром контррэволюцыйных элементаў, у якую-б тогу яны ні апраналіся.

Такавы выдатныя першыя вынікі соцыялістычнага будаўніцтва ў заходніх абласцях БССР, такавы пераможныя вынікі ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

(«Правда» ад 24 сакавіка).

ЛЕНІН АБ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫЦЫ СОВЕЦКАЙ УЛАДЫ

Вялікая Кастрычніцкая рэволюцыя раскалола свет на дзве прынцыпова розныя па эканоміцы, дзяржаўнаму, палітычнаму ладу і знешняй палітыцы сістэмы: свет соцыялізма і свет капіталізма.

Паяўленне маладой соцыялістычнай дзяржавы ў асобе совецкай Расіі было сустрэта ў штыкі імперыялістамі ўсяго свету, у першую чаргу англа-французскім імперыялізмам. Англія і Францыя разлічвалі дабіць свайго адвечнага праціўніка—Германію—за лік крыві рускіх салдат. Прарыў імперыялістычнага ланцуга ў расійскай імперыі зблытаў усе карты Антанты, бо Расія выйшла з ліку саюзнікаў.

Адным з першых дэкрэтаў совецкай улады быў дэкрэт аб міры, дэкрэт, якога страсна чакалі ўсе змучаныя імперыялістычнай вайной народы.

8 лістапада 1917 года Другі Ўсерасійскі з'езд Советаў па ініцыятыве Леніна прапанаваў усім ваюючым краінам пачаць неадкладныя перагаворы аб справядлівым дэмакратычным міры, міры без анексій і кантрыбуцый. Услед за гэтым зваротам наследваў рад другіх зваротаў Совета Народных Камісараў і Наркамата Замежных Спраў.

Ленін у сваіх артыкулах і прамовах, Соўнарком і Народны Камісарыят Замежных Спраў у сваіх зваротах выкрывалі яўна грабіцельскі характар імперыялістычнай вайны, гэтай злачыннай крывавай бойні народаў для драпежніцкіх інтарэсаў групы капіталістаў. Лозунг «Далоў імперыялістычную вайну!» магутна прагрымеў на ўвесь свет.

Соцыялістычная рэволюцыя ў Расіі палажыла пачатак рашучай барацьбе за спыненне вайны, за ўстанаўленне міру. На чале гэтай барацьбы сталі Ленін і Сталін, маладая совецкая ўлада.

Верны ленінска-сталінскаму вучэнню аб праве нацый на самавызначэнне аж да аддзялення, совецкі ўрад аб'явіў незалежнасць раней прыгнечаных царызмам народаў, у тым ліку Польшчы, Фінляндыі, Прыбалтыйскіх краін. Гэта было новае з'явішча ў гісторыі чалавецтва. Магутнае ленінскае слова глыбока пранікла ў сэрцы працоўных мас усяго света, і яно знайшло сваё выражэнне ў спачуванні і сімпатыі к новай соцыялістычнай дзяржаве, к яе правадыру і арганізатару — Леніну.

Па ініцыятыве Леніна і Сталіна совецкі ўрад звярнуўся к Германіі і Аўстрыі з прапановай пачаць мірныя перагаворы.

Велізарных цяжкасцей каштавала Леніну і Сталіну дабіцца заключэння міру, які так неабходны быў для Совецкай рэспублікі. Подлыя здраднікі совецкага народа трацкісты і бухарынцы разам з «левымі» эсэрамі і агентамі англа-французскага імперыялізма спрабавалі ўсімі мерамі сарваць мірныя перагаворы з Германіяй, сарваць перадышку.

Даказваючы неабходнасць заключэння Брэсцкага міру, Ленін вучыў партыю і народ, што знешняя палітыка совецкай дзяржавы павінна быць накіравана на тое, каб атрымаць перадышку, як-бы яна ні была кароткатэрміновай. Мы павінны, указваў Ленін, паслядоўна праводзіць палітыку міру, праяўляючы вытрымку, хладнакроўе, агляджальнасць, асцярожнасць і адначасова развіваць творчую, будаўнічую работу ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага жыцця краіны, умацоўваць дыктатуру пролетарыята і абароназдольнасць краіны.

Перадышка, аб якой гаварыў Ленін пасля заключэння Брэсцкага міру, аказалася кароткатэрміновай. Скора навісла пагроза інтэрвенцыі, наход імперыялістаў супроць совецкай дзяржавы.

Мы сталі абаронцамі пасля 7 лістапада, гаварыў Ленін, мы за абарону соцыялістычнай бацькаўшчыны.

Натхняемы і кіруемы Леніным, совецкі ўрад няўхільна і настойліва праводзіў палітыку міру.

Па настаянню Леніна ў снежні 1919 года совецкі рад зноў прапанаваў Англіі, Францыі, ЗША, Італіі і Японіі, усім разам і кожнай паасобку неадкладна пачаць перагаворы аб міры. Совецкі ўрад быў гатоў выслухаць і абгаварыць любыя прапановы капіталістычных дзяржаў. Усё было дарэмна. Англа-французскія капіталісты не хацелі дапусціць існавання Совецкай соцыялістычнай рэспублікі, ім хацелася сцерці яе з твару зямлі сілай зброі.

У «Пісьме к амерыканскім рабочым» Ленін пісаў:

«Сцярвятнікі англа-французскага імперыялізма, нажыўшыся на грабяжы калоній і на бойні народаў, працягнулі вайну вось ужо скора на цэлы год пасля Брэста, і яны-ж «абвінавачваюць» нас, бальшавікоў, прапанаваўшых справядлівы мір усім краінам, нас, парваўшых, апублікаваўшых, аддаўшых усеагульнай ганьбе тайныя злачынныя дагаворы паміж былым царом і англа-французскімі капіталістамі.

Рабочыя ўсяго свету, якой-бы краіне яны ні жылі, вітаюць нас, спачуваюць нам, рукапляскаюць нам за тое, што мы парвалі жалезныя кольцы імперыялістычных рудных дагавораў, імперыялістычных ланцугоў,—за тое, што мы вырваліся на свабоду, пайшоўшы на самыя цяжкія ахвяры для гэтага,—а тое, што мы, як соцыялістычная рэспубліка, хаця-б і сцерзаная, рабленая імперыялістамі, засталіся па-за імперыялісцкай вайной і перад усім светам паднялі сцяг міру, сцяг соцыялізма». (Ленін, том XXIII, стар. 180—181).

Совецкая соцыялістычная рэспубліка пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна адбіла напор інтэрвенцыі. Мы вышлі пераможцамі з грамадзянскай вайны. Мы перамаглі ў сілу многіх унутраных аб'ектыўных і суб'ектыўных умоў, якіх не было і не магло быць у нашых ворагаў. Нам дапамог рабочы клас ваюючых супроць нас краін, нам дапамаглі супярэчнасці паміж самімі імперыялістамі.

У той час, як совецкі ўрад праводзіў сваю міралюбівую палітыку і абараняўся ад нападу інтэрвентаў, англа-французскія «сцярвятнікі» навязалі Германіі нечуваны ў гісторыі страшэнны грабіцельскі мірны дагавор у Версалі (28 чэрвеня 1919 года).

Ленін выкрыў перад працоўнымі ўсяго света грабіцельскі характар Версальскага дагавора. Ён пісаў:

«Германіі быў навязан мір, але мір гэта быў ліхвярскі, мір душыцеляў, мір мяснікоў, таму, што яны разграбілі і раздрабілі Германію і Аўстрыю. Яны пазбавілі іх усіх сродкаў жыцця, накінулі дзяцей галадаць і паміраць з голаду... Што такое Версальскі дагавор? Гэта нечуваны грабіцельскі мір, які дзесяткі мільёнаў людзей, і ў тым ліку самых цывілізаваных, ставіць у становішча рабоў. Гэта не мір а ўмовы, прадыктаваныя разбойнікамі з нажом у руках безабароннай ахвяры» (Ленін, том XXV, стар. 417—418).

У красавіку 1920 г. Антанта, у асаблівасці французскі імперыялізм, нацкавала на нашу краіну панскую Польшчу, створаную Версальскім дагаворам, як плацдарм Антанты для наступлення на краіну соцыялізма.

Чырвоная Армія, пасля таго, як наша прапанова аб міры была адхілена, апракінула наскокі зарваўшыхся польскіх паноў. У кастрычніку таго-ж года быў заключан мір.

Ленін прыдаваў вялікае гістарычнае міжнароднае значэнне перамозе Чырвонай Арміі над белапалякамі. Чырвоная Армія паказала ўсю нетрываласць Версальскага міру. Паражэнне Польшчы было паражэннем Антанты. Совецкая Расія выступіла, як сусветная сіла, здольная разрушыць Версальскі дагавор і вызваліць сотні мільёнаў людзей у большасці краін зямлі (там-жа, стар. 419).

Ленін геніяльна прадказваў: «Акрэпне Совецкая Расія, і разляціцца Версальскі дагавор, як ён ледзь не разляцеўся ў ліпені 1920 года ад першага ўдару Чырвонай Арміі» (там-жа, стар. 420).

Зараз ад Версальскага дагавора амаль нічога ўжо не засталося. Уладак Версальскай сістэмы — панская Польшча—распалася, як

УВАГА ПРЫГАРАДНЫМ ГАСПАДАРКАМ

Клопаты аб паляпшэнні бытавых умоў працоўных — гэта адна з важнейшых задач, якая стаіць перад кожнай профсаюзнай, гаспадарчай і партыйнай арганізацыяй. Рабочыя нашых соцыялістычных фабрык і заводаў пераконваюцца на кожным кроку, што пытанням паляпшэння іх бытавых умоў удзяляецца выключная ўвага.

На радзе камбінатаў і фабрык Беластока створаны сталовыя і буфеты, якія абслугоўваюць тысячы рабочых снеданнямі і абедамі па даступнай цане.

Расшырэнне сеткі фабрычных сталовых і паляпшэнне іх работы ў многім залежыць ад стварэння трывалай і багатай крыніцы харчовых рэсурсаў. Такой крыніцай павінны і могуць быць падсобныя прыгарадныя гаспадаркі.

У нашай вобласці ёсць поўная магчымасць стварыць сетку прыгарадных гаспадарак. Маёнткі, якія раней служылі сродкам нажывы для польскіх памешчыкаў, сталі здабыткам народа і зараз могуць забяспечыць патрэбы працоўных.

Усе асноўныя камбінаты і рад тэкстыльных фабрык Беластока і Беластоцкага раёна ўжо атрымалі дастатковую колькасць зямлі разам з жылёвымі дамамі, гаспадарчымі пабудовамі і сельскагаспадарчымі машынамі. Тэкстыльны трэст адпусціў сродкі для адпаведных капіталаўкладанняў. Зараз патрэбна прывесці гаспадарку ў поўную гатоўнасць, арганізавана правесці вясеннія палявыя работы.

Неабходна зараз-жа правесці рамонт сельскагаспадарчых машын, забяспечыць гаспадаркі рабочай сілай, паклапаціцца аб адпаведнай колькасці цягавай сілы. Між тым некаторыя прадпрымствы, як 3-і камбінат, 23 фабрыка, толькі зараз прыступілі да прыёмкі сваіх гаспадарак. У падсобнай гаспадарцы 2-га камбіната яшчэ не паклапаціліся аб набыцці насення.

Падсобным гаспадаркам трэба даць адпаведны напрамак. Нельга, як у былых памешчыцкіх маёнтках, засяваць большасць плошчы зернавымі культурамі, а трэба ў асноўным пераключыцца на бульбу і гародніну. Між тым на падсобнай гаспадарцы 2-га камбіната ў Ліпніках палявая зямля займае 145 га, а агарод і сад — 5 га. Такія невялікія агароднія плошчы ні ў якім разе не могуць забяспечыць гароднінай рабочыя калектывы, якія налічваюць па тысячы чалавек. Тому трэба максімальна пашырыць плошчу пад агародамі.

У большасці падсобных гаспадарак зямля не ўзарана наззябліва і таму прыдзецца ўзяліць максімум увагі вясенняй апрацоўцы зямлі. Усё гэта патрабуе тэрміновай падрыхтоўкі сельгасмашын, рабочай і цягавай сілы. Нельга забываць і аб своечасовай вывазцы гною і іншых відаў угнаення, каб забяспечыць багаты ўраджай.

Для паспяховага правядзення ўсіх гэтых работ неабходна, каб пытаннямі падсобных гаспадарак больш чым да гэтага часу цікавіліся фабрычныя камітэты, праводзячы гэту работу разам з дырэкцыямі фабрык.

Побач з пытаннем падсобных гаспадарак паўстае пытанне індывідуальнага агародніцтва працоўных. Ва ўсходніх абласцях Саюза за апошнія годы сотні тысяч рабочых і служачых абзавяліся агародамі, у якіх вырошчваюць гародніну для сваіх сямей. З вялікай любоўю яны даглядаюць за сваімі участкамі, дабіваючыся выдатных ураджаяў. У адной толькі Сталінскай вобласці УССР плошча, занятая індывідуальнымі агародамі, прасціраецца на 40 тысяч гектараў. Развіццё індывідуальнага агародніцтва іграе нямалую ролю ў стварэнні бульбяна-гароднінных баз вакол прамысловых цэнтраў.

Абком саюза шарсцянікаў зусім правільна выступіў з ініцыятывай разгортвання рабочага агародніцтва на прадмесцях Беластока. Ён звярнуўся ў гарвыканком з прапановай прадаставіць у карыстанне рабочых закінутыя агароды і іншыя зямельныя ўчасткі на прадмесцях: Выгода, Антанюк, Бячуркі і Крыўляны, якія раней належалі памешчыкам і духавенству. Незразумела, чаму гарвыканком яшчэ не даў канкрэтны адказ на прапанову абкома саюза шарсцянікаў. Трэба ўсямерна заахвочваць ініцыятыву рабочых і служачых, якія жадаюць сваімі сіламі апрацоўваць агародныя ўчасткі.

Падсобныя гаспадаркі і індывідуальнае агародніцтва павінны стаць магутным фактарам паляпшэння забяспячэння рабочых.

І. Кавальскі.



Пры панаванні польскіх магнатаў у Заходняй Беларусі жанчыны не дапускаліся да працы на чыгуначным транспарце. Ім прадастаўлялася толькі работа прыбіральшчыцы. Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія, вызваліўшая з-пад панскага прыгнёту працоўных Заходняй Беларусі, прадаставіла поўнае роўнапраўе жанчыне. На курсы токараў пры Брэсцкіх цэнтральных вагонных майстэрнях першай паступіла былая прыбіральшчыца, нядаўна прынятая ў рады комсамола, Ольга Іосіфаўна Аўчарык. Вучобу яна скончыла з ацэнкай «выдатна» і стала токарам 3 разрада. Норму яна выконвае на 150—160 працантаў.

На здымку: тав. Аўчарык за работай. (Фотахроніка БЕЛТА).

НА АЛІМПІЯДЗЕ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ

У перапоўненым зале клуба тэкстыльшчыкаў праходзіў другі дзень прагляду мастацкай самадзейнасці. Госці — рабочыя камбінатаў і фабрык Беластока — прышлі задоўга да пачатку прагляду і з нецярпеннем чакалі першых выступленняў. У зале сабралося звыш 500 чалавек.

Праграма другога дня складалася з выступленняў мастацкіх калектываў і індывідуальных выканаўцаў 1-га, 4-га, 5-га і 8-га камбінатаў, 18 і 29 фабрык. Трэба адзначыць, што праграма ў параўнанні з першым днём значна расшырана. Кожны камбінат і фабрыка прадставілі па аднаму калектыўнаму выступленню і многа індывідуальных выканаўцаў.

Лепшым мастацкім калектывам аказаўся хор 1-га камбіната пад кіраўніцтвам тав. Закса. Хор складаецца з 50 чалавек, спявае на 4 галасы. Бурнымі апладысментамі сустракаюць прысутныя добрае выкананне хорам песень „Вінтоўка“ (салістам выступіў рабочы Трэмбач), „На Урале“ і іншых.

Велізарным поспехам карысталася ў прысутных паказаная драматычным калектывам 8-га камбіната карціна з 2-га акта тэатральнай пастаноўкі Данеля „Зямка Копач“ на яўрэйскай мове. У пастаноўцы ўдзельнічала 15 чалавек рабочых. Большасць маладых актораў паказалі таленавітую ігру. Відаць было, што яны многа працавалі над сваімі ролямі. Добра справіўся са сваёй задачай рэжысёр пастаноўкі, рабочы 8-га камбіната тав. Суд.

Нядрэнна паказаў сябе драматычны калектыў 29 фабрыкі, які пад кіраўніцтвам тав. Леўковіч сыграў аднаактавую сцэнку на яўрэйскай мове „Госць“. Галоўную ролю ў п'есе выконваў рабочы 29 фабрыкі тав. Казанін. Акрамя драмгуртка 29 фабрыка мае хор у складзе 15 чалавек, які выканаў „Полюшка-поле“, бірабіджанскую плясавую, беларускую народную песню і іншыя.

18 фабрыка дала пастаноўку Міцкуна „Справа 147“ на польскай мове. Гэта п'еса, якая ішла ўжо разы тры ў тэатры „Палас“, была пастаўлена бледна з прычыны адсутнасці касцюмаў і дрэннай абстаноўкі.

4-м камбінатам быў паказан скетч Ільфа і Петрова „Гратэска“. Харавы ансамбль 5 га камбіната пад кіраўніцтвам тав. Савіцкага выканаў некалькі песень.

Вельмі разнастайныя выступленні індывідуальных выканаўцаў. Выступалі дэкламатары, расказчыкі на польскай, яўрэйскай і рускай мовах, спевакі і інш.

Удалым было выступленне рабочага 4-га камбіната тав. Ліпскага, які прачытаў твор „Кароль“ і рабочага гэтага-ж камбіната тав. Маліняк, які чытаў урывак з паэмы Маякоўскага „Ленін“.

Усяго выступіла на праглядзе 150 чалавек.

Л. Лірская.

ПЕРШЫЯ СПРОБЫ ПЯРА

Пад яркім сонцам Сталінскай Канстытуцыі паднімаюцца з нізоў і расцвітаюць народныя таленты.

Рэдакцыя абласной газеты «Вольная Праца» атрымлівае штодзённа нямала вершаў пачынаючых аўтараў.

Перад намі — стопка вершаў пачынаючых, прысвечаных выбарам. З усіх вылучаюцца чатыры вершы медыцынскай сястры Хорашчанскай лячэбніцы Ніны Брадоўскай. Пачынаючая паэтэса дастаткова валодае рытмам і рыфмай верша, але ў яе мала мастацкіх вобразаў, мала канкрэтных жыццёвых фактаў. Вершы яе занадта рытарычныя. Так, верш «Бойцам» Ніна Брадоўская заканчвае радкамі:

Мы шлем привет тебе,
страна родная,
Тебе, Москва! Ты наша
мать, сестра!
Вождю, маршалу, братьям,
повторяя,
Шлем эхом мировым —
«ура».

Вось гэтага «ура» занадта многа ў вершах Брадоўскай, а таму яны гучаць не заўсёды пераканаўча.

Лепшым з вершаў Ніны Брадоўскай, прысланых у рэдакцыю, з'яўляецца верш «Дэпутату Турлейскаму».

Наш депутат, товарищ наш
Турлейский,
Ты отвези в Москву наш
пламенный привет.
Скажи, что Белорусь, что
край Полесский,
Что все за Сталина и за
Совет.
Что помнят наши дети подлость панов,
Продать себя уж больше
не дадут.
Что радостно и вечером и
рано
Про вольный край і вольный труд поют.
Скажи маршалу, что живой
стеною
Пойдем мы на врага,
когда нас позовут.

У гэтым вершы Брадоўская выказала думкі і пачуцці ўсіх свабодных грамадзян заходніх абласцей нашай радзімы.

Под глубокими морями,
И над дальними землями,
От степных песков
сыпучих,
До высоких гор могучих
Песню громко воспевайте,
Славу всюду воздавайте
Отцу народному.
Солнцем ты нас озаряешь,
Силой воли воспитаешь,
Ты нас счастьем даришь.
И не сыскать среди народов света
Вождя подобного тебе.
. . . .
Пусть звезда твоя сияет,
Пусть народам озаряет
Счастливой жизни путь.

Вершы, якія прысылаюцца ў рэдакцыю, паказваюць, што ў нашай вобласці ёсць нямала здольных пачынаючых аўтараў. Але ім трэба многа яшчэ працаваць над сабой, вучыцца сур'ёзна і настойліва, каб пісаць не толькі добрыя радкі, а і добрыя вершы.

М. Валкавыцкі піша:

«У мяне напісана многа вершаў, але я не атрымліваю ніякай дапамогі. Чуў, што ў Беластоку ёсць Дом пісьменніка, але да каго там звярнуцца — не ведаю».

Скарга тав. Валкавыцкага характарызуе становішча з літаратурнай вучобай пачынаючых у нашай вобласці. Задача аргкамітэта Саюза совецкіх пісьменнікаў — дапамагчы пачынаючым авалодаць паэтычным майстэрствам.

Т. Л.

Комплекс „Гатоў да працы і абароны“

26 лістапада 1939 года СНК Саюза ССР зацвердзіў палажэнне і нормы новага ўсесаюзнага фізкультурнага комплекса «Гатоў да працы і абароны Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік».

Пастанова Соўнаркома СССР аб увядзенні новага комплекса—адно з звенняў у выкананні рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б) аб комуністычным выхаванні. Увядзенне новага, больш дасканалага комплекса паслужыць магутным стымулам далейшага росту і ўмацавання совецкага фізкультурнага руху.

Прыняты IV унечарговай Сесіяй Вярхоўнага Совета Саюза ССР закон аб усеагульным вайсковым абавязку прад'яўляе да фізічнай падрыхтоўкі моладзі павышаныя патрабаванні. На аснове новага комплекса ГПА павінна быць перабудавана ўся работа па фізічнаму выхаванню школьнікаў. Вялікія задачы стаяць у гэтай галіне перад органамі Наркомасветы, на мясцах, перад кожнай школай.

Рашуча паляпшаючы ўсю сістэму вучэбна-спартыўнай работы, новы комплекс адкрывае шырокія магчымасці для фізкультурнікаў спалучаць заняткі любімым відам спорту з усебаковай фізічнай падрыхтоўкай.

У новым комплексе ГПА нормы падзяляюцца на абавязковыя для ўсіх здаючых і нормы па выбару, з якіх фізкультурнік можа выбраць найбольш любімыя, найбольш падыходзячыя для яго віды спорту. Фізічныя практыкаванні ў комплексе ахапляюць каля 60 відаў спорту. У абавязковых нормах прадстаўлены асноўныя фізічныя практыкаванні, якія маюць ваеннае і агульнааздараўленчае значэнне: гімнастыка, бег, перамаганне перашкод, плаванне, лыжы. Акрамя таго абавязкова таксама веданне задач фізкультурнага руху ў СССР і асноў асабістай гігіены.

У групах норм па выбару падабраны фізічныя практыкаванні, якія выяўляюць і развіваюць пэўныя псіха-фізічныя якасці: скорасць, лоўкасць, трываласць і т. д.

У першыя ступені ГПА, у групе, якая вызначае якасць скорасці, фізкультурнік можа выбіраць паміж бегам на 100 метраў, плаваннем 50 метраў, веласіпеднай гонкай на 500 метраў і бегам на 500 метраў на каньках. У другой ступені комплекса ўстаноўлена сістэма паўторных іспытаў пры пераходах у наступную ўзроставую катэгорыю. Пры здачы норм БГПА і ГПА другой ступені ўводзяцца таксама дыферэнцыраваныя ацэнкі: «здаў» і «выдатна здаў». Усё гэта прымушае фізкультурніка павышаць узровень сваей фізічнай падрыхтоўкі.

Комплекс ГПА, у поўнай адпаведнасці з законам аб усеагульным вайсковым абавязку, устанаўлівае сістэму, па якой школьнік-падростак атрымлівае да 16 год значок БГПА, да моманту скančэння поўнай сярэдняй школы да 17—18 год—значок ГПА першай ступені, а ў Чырвонай Арміі ці скора пасля скančэння ваеннай службы—значок ГПА другой ступені.

Рашэннем Соўнаркома ўстаноўлен свабодны і бясплатны прыём норм ГПА ад усіх працоўных, дапушчаных урачом да здачы норм, на ўсіх стадыёнах і спортпляцоўках, водных і лыжных станцыях і т. д.

Неабходна сур'ёзна папрацаваць над падрыхтоўкай матэрыяльнай базы фізкультурных арганізацый. Гэта асабліва адносіцца да заходніх абласцей Беларусі, дзе спартыўныя збудаванні патрабуюць карэннага пераабсталявання. Акрамя таго вялікая работа прадстаіць па падрыхтоўцы актывістаў-грамадчыкаў і ўсяго інструктарска-выкладчыцкага саставу. У сувязі з арганізацыяй работы па комплексу ГПА варта арганізаваць шырокую сетку курсаў і семінараў ва ўсіх фізкультурных арганізацыях заходніх абласцей Беларусі.

Асаблівая адказнасць ускладаецца рашэннем Соўнаркома на органы аховы здароўя, якія павінны арганізаваць рэгулярны медыцынскі кантроль над здароўем здаючых нормы комплекса ГПА і ўсіх, хто займаецца фізкультурай і спортам.

Усю работу па прапагандзе новага комплекса, па агітацыі за падрыхтоўку і здачу норм, па пераходу фізкультурнага руху на новы комплекс трэба праводзіць у цесным кантакце з комсамолам, профсаюзамі, абароннымі арганізацыямі. У гэтай рабоце будзе дасягнут поспех толькі ў тым выпадку, калі яна будзе будавацца на аснове прыцягнення шырокай грамадскасці, шырокага актыва.

Новы комплекс ГПА павінен быць даведзен да кожнага фізкультурніка, да кожнага маладога чалавека, аб ім павінны ведаць самыя шырокія масы працоўных.

З. Трэскоўскі.

картачны домік. Пад мудрым кіраўніцтвам таварыша Сталіна. Совецкі Саюз вызваліў ад панскага іга 13 мільёнаў адзінакроўных з намі украінцаў і беларусаў і ўключыў іх у сваю вялікую соцыялістычную сям'ю.

Ленін вучыў нашу партыю, краіну да канца скарыстаць усе супярэчнасці паміж імперыялістамі ў мэтах захавання мірных узаемаадносін з усімі народамі і забеспячэння ўмоў для росту эканамічнай і палітычнай магутнасці Краіны Советаў. «. . .Нам усяго даражэй,— гаварыў Ленін, — захаванне міру і поўная магчымасць прысвяціць усе сілы аднаўленню гаспадаркі, мы павінны быць надзвычай і надзвычай асцярожны». (Ленін, том XXVI, стар. 152—153).

Ленін папярэджваў пры гэтым, што патрэбна ўмець скарыстаць супярэчнасці і супроцьлегласці паміж імперыялістамі, патрэбна скарыстаць не дробныя, выпадковыя рознагалосеі, а карэнныя супярэчнасці, якія абумоўліваюцца глыбокімі эканамічнымі прычынамі. Ленін указваў тады на тры асноўных, карэнных супярэчнасцей у капіталістычным свеце: 1) паміж Японіяй і Амерыкай у барацьбе за Кітай і астравы на Ціхім акіяне; 2) паміж Амерыкай і ўсім астатнім капіталістычным светам з-за калоній і прыбыткаў; 3) паміж Антантай і Германіяй у сілу несправядлівасцей Версальскага дагавора.

Умовы існавання Германіі пасля Версаля штурхаюць Германію і яе народ на збліжэнне з Совецкай краінай.

«Не трэба рабіць вываду, указаў Ленін,—што дагаворы могуць быць такімі, як Брэст, або Версаль. Гэта няверна. Можа быць і трэці дагавор, выгадны для нас» (Ленін, т. XXV, стар. 498—499).

У вывадах Леніна канцэнтруецца вялікая сіла геніяльнага навуковага прадбачання.

На XVIII з'ездзе ВКП(б) таварыш Сталін даў глыбока навуковы аналіз міжнародных адносін і на гэтай аснове намеціў гістарычную праграму знешняй палітыкі Совецкага Саюза, праграму, стаўшую паваротным пунктам не толькі ў гісторыі Еўропы, але і ўсяго света. Указанні таварыша Сталіна служаць асновай далейшага ўмацавання міжнародных пазіцый краіны соцыялізма.

Пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна, апіраючагася на ленінскія прынцыпы знешняй палітыкі Совецкага Саюза, наш совецкі народ устанавіў прыязныя ўзаемаадносіны з народам Германіі. Дагаворы аб ненападзе і дружбе, заключаныя ў мінулым годзе з Германіяй, маюць выключна вялікае гістарычнае значэнне у міжнародным жыцці: яны сарваюць імперыялістаў Антанты, стрымліваючы іх прагныя апетыты і пасяганні на незалежнасць малых краін. Гэтыя дагаворы выгадны для нашай краіны, і для Германіі, і для ўсіх тых краін, якія не жадаюць распальвання другой імперыялістычнай вайны.

Ленін указваў, што самы факт існавання совецкай соцыялістычнай рэспублікі і сіла яе магутнага супраціўлення Антанце значна змяняе міжнароднае становішча. Капіталістычныя краіны, наперакор сваім жаданням, вымушаны ўступаць з намі ў гандлёвыя адносіны і тым самым памагаць нам умацоўваць наш гаспадарчы рост.

Ленін прапаноўваў як мага настойлівей праводзіць палітыку міру на аснове развіцця гандлёвых адносін з усімі краінамі. Гэтыя ўказанні Леніна свята выконваюцца.

Ленін звяртаў асаблівую ўвагу на клапатлівыя адносіны к малым суседнім краінам, уваходзіўшым раней у састаў Расійскай імперыі, у прыватнасці, к Эстоніі, Латвіі, Літве, Фінляндыі, да краін, якія атрымалі незалежнасць толькі дзякуючы Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі і мірнай, інтэрнацыяналісцкай палітыцы совецкай улады. Ленін прапаноўваў рабіць гэтым малым краінам як мага больш уступак, каб канчаткова рассеяць векавое недавер'е, народжанае царскай нацыяналістычнай, вялікадзяржаўнай палітыкай.

І гэта ўказанне Леніна няўхільна выконваецца. Пры асабістым удзеле таварыша Сталіна наш совецкі ўрад, натхняемы ленінска-сталінскай палітыкай міру, заключыў дагаворы аб узаемадапамозе з Эстоніяй, Латвіяй, Літвой, а да гэтага з Мангольскай Народнай Рэспублікай. Гэтыя дагаворы ўмацавалі безапаснасць граніц Совецкага Саюза і граніц гэтых краін. Гэтыя дагаворы спрыяюць развіццю гаспадарчага жыцця нашых суседзяў і поўнасцю адказваюць абаюдным інтарэсам абодвух старон. Совецкі Саюз праявіў выключны акт вялікадушша, дружбы і міралюбія, калі перадаў Літве гвалтоўна захопленыя ў яе Польшчай і вызваленыя Чырвонай Арміяй горад Вільна і Віленскую вобласць.

Ленінска-сталінская палітыка міру нясе з сабой вызваленне народам малых краін, яна выклікае захапленне ў працоўных усяго света.

Пад геніяльным кіраўніцтвам таварыша Сталіна наша краіна ператварылася ў вялікую і магутную краіну перамогшага соцыялізма. Унутраная палітыка яе цесна звязана з знешняй палітыкай, з палітыкай міру.

Наша краіна мае зараз велізарную вагу і аўтарытэт у міжнародных зносінах. На ўсе буйнейшыя падзеі ў міжнародным жыцці Совецкі Саюз аказвае свой магутны ўплыў.

Ленінскія прынцыпы знешняй палітыкі—у дзеянні. Вялікі Сталін, ператвараючы ленінскія ўказанні і развіваючы іх далей у гістарычна змяніўшыхся ўмовах, прывёў нашу соцыялістычную радзіму да выдатных перамог на міжнароднай арэне.

В. Кружкоў.

КЕКСГОЛЬМ СЁННЯ

І дахі, і вуліцы пакрыты таўшчэзным войлакам снегу. Ні аднаго дымка, ні руху, ні гуку. На мосце цераз Вуоксу над чорнай вадой, якая кіпіць у ледзяных берагах, патруль фінскіх салдат, стомленых і абыякавых... Зграя дзікіх качак лётае над ім.

Адышоў апошні фінскі поезд з салдатамі. Апошняя сустрэча прадстаўнікоў камандавання фінскага і нашага. Следам за тым нашы войскі ўвойдуць у гарадок.

У кухні невялікага доміка падпісваецца пратакол перадачы горада. Некалькі мінут размовы перад развітаннем.

Фінскі ротмістр—кавалерыст. Аматар коннага спорту. Ведае ўсё аб конных заводах у СССР і нашых лепшых майстрах верхавой язды. Ён знаўца зброі і хваліць нашы аўтаматы. Але самая моцная зброя савецкай арміі, па яго думцы,—авіяцыя.

— Мы былі скаваны ёю. Мы не маглі перасоўвацца і перавозіць ваенныя грузы з-за яе. Калі б мы ішчэ да вайны не загатовілі снабжэнчых баз, мы-б асталіся без боеприпасаў і харчавання на перадавых пазіцыях, — гаворыць ён.

— Ваша артылерыя, — працягвае ротмістр, — дзейнічала бліскуча. Артылерыйскі полк, у якім я служыў, у час аднаго марша быў амаль цалкам знішчан агнём вашых батарэй. Я быў ранен у час гэтага абстрэлу.

Гутарка заканчваецца ўзаемнымі прывітаннямі і пажаданнямі адпачынку і шчасця. Афіцэры усаджваюцца ў старэнькі форд і ад'язджаюць.

Гэта было днямі.

Сёння Кексгольм кіпіць новым жыццём. Баявыя часці прайшлі праз горад, прасоўваючыся да новай граніцы, а тут працуюць не пакладаючы рук сапёры і сувязісты. Уласна направільна гаварыць аб сапёрах як аб войсках небяспекі. Сапёры правілі сябе геройчна. У Кексгольме мы чулі многа расказаў аб іх подзігах. Вось выпрымкі з іх.

...Лейтэнант Карапецянц. Ён выявіў і абясшкодзіў 497 мін.

...Басц Мураўёў. Ён ішоў наперадзе танкаў і пяхоты, ліквідуючы мінныя палі. Яго маскіроўчаны халат прабіт кулямі ў некалькіх месцах.

...Сапёр Нікішаў. Ён пракладваў дарогі ў лесе пад артылерыйскім агнём і яшчэ падлічваў прадукцыйнасць працы сваю і сваіх таварышоў у гэтых неймаверных умовах работы.

І сотні такіх самых.

За дваццаць дзён снежня часць, якой камандуе тав. Гур'еў, знішчыла 1.200 пагонных метраў завалаў, зняла 291 мін і выняла 267 кілаграмаў выбуховых матэрый, пабудавала і адрамантавала 17 мастоў. Толькі адно падраздзяленне гэтай часці (камандзір тав. Панамароў) за дваццаць сутак адрамантавала 70 кіламетраў дарог.

З першых дзён кампаніі часць рухалася разам з перадавымі войскамі, а іншы раз і наперадзе іх, рыхтуючы шляхі ўсёй грандыёзнай тэхнікі наступаючай арміі. І вось цяпер яны ў Кексгольме. Тут ужо іншая абстаноўка, іншыя клопаты.

У горадзе няма ніводнай цэлай шыбы. Вуліцы непраходныя ад снегу. У многіх дамах сарваны дзверы, вырваны аконныя рамы. Усё гэта трэба прывесці ў парадак, прыстасаваць для руху і жылля. Лапаты сапёраў шуршаць па снезе, іх малаткі стукаюць ва ўсіх канцах Кексгольма.

* * *

Кірка — самы высокі будынак у горадзе. Адтуль усё, як на далоні. Лясы навокал, а ў сярэдзіне, як на старыннай карціны, вострадахі гарадок з правільнымі вулачкамі і акуратнымі домікамі. Удалі над лесам узвышаюцца велізарныя корпусы завода, які вырабляе картон.

Картонны камбінат абсталяван па апошняму слову тэхнікі і вельмі вялікі. Дзве велізарных самачэрпкі стаяць у надзвычайна добрым цэху даўжынёй каля 200 метраў. Далей узвышаюцца будынкі загатоўчых цэхаў 50 метраў вышынёй. Склад гатовай прадукцыі і упакоўачны цэх прадстаўляюць сабой груду развалін. Як відаць, тут бушаваў пажар і на пад логе асталіся толькі скручаныя і абвугленыя жалезныя стужкі, якімі былі звязаны цюкі картону. Рольгангавая ўстаноўка, што падавала гатовую прадукцыю да ўпакоўачных станкоў, тырчыць над усім гэтым разбурэннем, як шкілет дапатопнай жывёлы. Увесь завод у едкім серным дыме.

Каты і цыстэрны, у якіх прыгатаўлялася маса, займаюць спецыяльныя будынкі, даволі добра захаваныя. Тут у поўзмроку можна бачыць абрысы труб, магутных стальных рэторт у некалькі паверхаў вышынёй, устаноўленых на бетонных калонах. І ў поўзмроку можна заўважыць, што гэтыя калоны апаясаны акуратнымі пакетамі, з высяляду падобнымі на тыя, з якіх адпушчаецца слівачнае масла ў дыетычных магазінах. Гэта — тол. Выпрабаваная выбуховая матэрыя вялікай разбуральнай сілы. Калі-б тыя, хто апаясваў гэтыя калоны, паспелі падпаліць шашкі, то, магчыма, загатоўчыя цэхі прадстаўлялі-б зараз тую-ж карціну, што і склад гатовай прадукцыі.

Няма кутка на заводзе, дзе не было-б відаць разбурэння. Ні адной варонкі ад авіябомб на тэрыторыі не відаць. Разбуралі фіны перад адступленнем.

У Кексгольме ёсць яшчэ адзін завод — лесапільны. Не гледзячы на тое, што ён акружан штабелямі піламатэрыялаў, ніякіх слядоў пажару на ім няма. Ён размешчан вельмі блізка ад картоннага камбіната і астаўся непашкоджаны.

На беразе ракі Вуоксы, на мысе, сярод бяроз узвышаецца маленькая крэпастка пятровскіх часоў. Там, у вежы, над маленькімі варотцамі, змяшчаўся музей, у якім былі сабраны рэчавыя сведчанні гісторыі гэтага горада.

Скрозь усё гэта разбурэнне і закінутасць можна ўжо прадбачыць кексгольмскую будучыню. Завод будзе адноўлен. На ім закіпіць работа і тысячы тон картону будуць грузіцца ў вагоны каля вакзала, ад якога зараз тырчаць адны сцены. Лесавозы павязуць дошкі і бярвенні па гладзі ладажскіх вод.

Па вуліцах зашуршаць шыны аўтамабіляў, дзіцячыя галасы зазвіняць у школах і новае жыццё зашуміць у савецкім Кексгольме.

Б. Агапаў.

(«Известия»)

ЗАМЕЖНАЯ ХРОНІКА

Газетнае адзяленне цэнтральнай палітычнай акадэміі Кітая ў Чунцыне выпусціла 42 журналістаў. З прывітальным лістом да выпускнікоў звярнуўся Чан Кай-шы.

* * *

Як паведамлялася, у Берлін для эканамічных перагавораў прыязджала літоўская эканамічная дэлегацыя. Нядаўна дэлегацыя звярнулася ў Каўнас. Перагаворы адкладзены з прычыны хваробы старшыні германскай дэлегацыі.

* * *

Абслугоўваючы персанал прыватных рэчных пераходных кампаній Югаславіі пачаў забастоўку пратэсту супроць адмовы суднаўладальнікаў аплачваць звыштэрміновую працу

ЗА РУБЯЖОМ

ГАЗЕТА „НЬЮ-ЙОРК ТАЙМС" АБ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Нью-Йорк, 27 сакавіка. (ТАСС). Амерыканскі буржуазны друк, які змяшчаў у час ваенных дзеянняў у Фінляндыі многа хлуслівых паведамленняў аб Чырвонай Арміі, зараз вымушан публікаваць паведамленні, якія поўнасцю супярэчаць хлуслівай інфармацыі, што раней публікавалася. У лютым «Нью-Йорк таймс» апублікавала рад паведамленняў свайго хельсінскага карэспандэнта аб «перамогах» Манергейма. Аднак цяпер гэтая газета вымушана абвергнуць хлуслівыя паведамленні, якія яна змяшчала раней. Тут асабліва меў уплыў націск чытачоў, патрабуючых праўдзівай інфармацыі аб Чырвонай Арміі. Газета «Нью-Йорк таймс», не ўпамінаючы аб хлуслівых паведамленнях, якія яна публікавала ў лютым, 26 сакавіка надрукавала паведамленне карэспандэнта агенцтва Норт амерыкен ньюс Олдрыча, які падрабязна апісвае баявую магутнасць Чырвонай Арміі. Олдрыч у час баявых дзеянняў быў у Фінляндыі, а цяпер знаходзіцца ў Стакгольме. Олдрыч піша, што савецкія бамбардзіроўшчыкі вельмі эфектыўныя. «Савецкія знішчальнікі дзейнічалі эфектыўней і лепш, чым любыя варожыя самалёты». Савецкія знішчальнікі не дазвалялі фінскім прадпрыняць бамбардзіроўкі савецкіх гарадоў. Савецкая авіяцыя вельмі аснашчона, а лётчыкі добра падрыхтаваны і трэніраваны як у галіне лётнай справы, так і ў галіне бамбардзіровак. Олдрыч указвае далей, што савецкія лётчыкі вельмі разумеюць тактыку варожых самалётаў. На савецкім самалёце апрача асноўнага пілота кіраваць самалётам могуць таксама назіральнікі і іншыя члены экіпажа. Савецкія лётчыкі добра экіпіраваны. Газета «Нью-Йорк таймс» змяшчае гэта паведамленне пад буйным загалоўкам: «Савецкія паветраныя сілы вельмі моцныя, бамбардзіроўшчыкі і знішчальнікі вельмі эфектыўны. Назіральнік у Фінляндыі бачыў сучасныя самалёты з добра трэніраванымі і добра экіпіраванымі лётчыкамі».

НА ПРАЦЭСЕ ДЭПУТАТАЎ-КОМУНІСТАЎ

ПАРЫЖ, 27 сакавіка. (ТАСС). Агенцтва Гавас паведамляе, што «трынаццатае пасяджэнне ваеннага трыбунала, які судзіць французскіх дэпутатаў-комуністаў, працягвалася 26 сакавіка з 13 гадзін да 19 гадзін. З боку адвакатаў не было ніякіх выступленняў, і трыбунал заслухаў пры зачыненых дзвярах некалькіх дэпутатаў. Усяго да гэтага часу дапытана 22 дэпутаты. Працэс будзе працягвацца да 27 сакавіка.

АНТЫВАЕННЫ РУХ АНГЛІІ

ЛОНДАН, 27 сакавіка. (ТАСС). Адбыўшаяся днямі ў Бірмінгаме гадзічная канферэнцыя акруговай арганізацыі нацыянальнага саюза гандлёвых служачых, якая налічвае 78 тысяч членаў, большасцю галасоў прыняла рэзалюцыю, асуджаючую імперыялістычную вайну ў Еўропе. Удзельнікі канферэнцыі патрабуюць ад генсовета трэд-юніёнаў спынення ўсялякага супрацоўніцтва з урадам і прадпрымцамі. У рэзалюцыі гаворыцца аб неабходнасці разгортвання барацьбы супроць наступлення капіталістаў на жыццёвы ўзровень і прав рабочага класа.


Паведамленне нарвежскага міністэрства замежных спраў

ОСЛО, 27 сакавіка. (ТАСС). Як перадае нарвежскае тэлеграфнае агенцтва, нарвежскае міністэрства замежных спраў паведаміла 26 сакавіка падрабязнасці інцыдэнта, які меў месца 22 сакавіка. Міністэрства заяўляе, што раніцой гэтага дня англійскі эсмінец, які знаходзіўся ў англійскіх тэрытарыяльных водах паблізу Обрэстана (паўднёва-заходняя Нарвегія), даў папераджальны залп па германскаму гандлёваму параходу, які ішоў у паўднёвым напрамку. Германскі параход не спыніўся, і англійскі эсмінец устрымаўся ад далейшага прымянення сілы. Выпушчаны з англійскага карабля снарад зваліўся каля чыгуначай станцыі, але не прычыніў шкоды.

Міністэрства замежных спраў прапанавала свайму пасланніку ў Лондане заявіць вострыя пратэст супроць гэтага парушэння нарвежскага нейтралітэта.

ВАЙНА НА МОРЫ

ЛОНДАН, 27 сакавіка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, у Паўночным моры патоплен нарвежскі параход «Камета» вадазмяшчэннем у 3.794 тоны. Уся каманда і пасажыры судна выратаваны другім параходам і дастаўлены ў адзін з партоў Англіі. Падрабязнасці пагібелі «Каметы» невядомы.



На здымку: Тав. І. Н. Розенцвайг першы двухстаночнік 23-й беластоцкай тэкстыльнай фабрыкі за работай. (Фота Сапір)

СПАБОРНІЦТВА ЛЕСАЗАВОДАЎ

Шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва сярод рабочых дзяржаўнага лесазавода № 5 у Валілах. Асабліва паказваюць узор у рабоце рабочыя першай змены. Сярод іх заключаны індывідуальныя соцумовы на датэрміновае выкананне квартальнага плана. Рамшчык Іосіф Лісоўскі перавыконвае дзённыя нормы выпрацоўкі на 203 проценты, рабочы Бурчак — на 160—165 процантаў, рамшчык Франц Бляхарчык — на 150 — 160 процантаў.

Рабочыя першай змены спаборнічаюць з другой зменай. Зараз калектыў завода рыхтуецца да праверкі вынікаў соцспаборніцтва за першы квартал паміж іх заводам і лесазаводам Чорная Весь.

Дзерманскі.

ЯК ІДЗЕ ПАШПАРТЫЗАЦЫЯ

У большасці гарадоў і мястэчак нашай вобласці пашпартызацыя праходзіць паспяхова. Пашпартным пунктам дапамагаюць партыйныя, савецкія, прафсаюзныя і іншыя арганізацыі.

Аднак у некаторых месцах усё яшчэ заўважаюцца перабоі ў забеспячэнні насельніцтва фотакарткамі. У Валкавыску, Гродна, Ломжы і Аўгустове няма дастатковай колькасці фотаматэрыялаў. Неабходнымі матэрыяламі не забяспечана і Беластоцкая дзяржаўная фатаграфія. Гэта выкарыстоўваюць асобныя ўласнікі прыватных фатаграфій якія вырабляюць фотаздымкі па спекуляцыйных цэнах.

Абласны пашпартны аддзел сумесна з радам гаспадарчых арганізацый прымае ўсе захады к таму, каб перабоі ў забеспячэнні насельніцтва фотаздымкамі неадкладна ліквідаваць. У раёны, дзе няма фатаграфій, накіроўваюцца спецыяльныя брыгады фатографаў. Аблпромсаюзам створаны ў Ломжы, Друскеніках і Бельску фотаарцелі.

Значна палепшыла сваю работу беластоцкая дзяржаўная фатаграфія. Яна зараз штодзённа абслугоўвае па 1000 чалавек, прычым з мэтаю, недапушчэння чаргі, вырабленыя фотакарткі выдаюцца насельніцтву ў некалькіх месцах горада.

Сярод насельніцтва наглядаецца вялікае жаданне хутчэй атрымаць савецкі пашпарт, хутчэй афарміць свае савецкая грамадзянства. Гэтая жаданне асабліва яскрава заўважалася перад выбарамі ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Рабочыя і служачыя імкнуліся да таго, каб у час галасавання выбарчым камісіям прад'яўляць савецкі пашпарт.

Зараз у Беластоку працуюць 20 пашпартных пунктаў. У хуткім часе дадаткова ачыняцца яшчэ рад пунктаў. Пашпартныя пункты, напрыклад, будуць створаны на вялікіх прадпрыемствах, а такама на буйнейшых чыгуначных станцыях.

В. Бемаў.

Горкаўская выстаўка

Сёння спаўняецца 72 годы з дня нараджэння вялікага рускага пісьменніка Алексея Максімавіча Горкага.

У сувязі з гэтым Цэнтральны музей А. М. Горкага пры Інстытуце сусветнай літаратуры адкрывае сёння ў беластоцкім Доме Чырвонай Арміі выстаўку «Жыццё, творчасць і рэволюцыйная дзейнасць А. М. Горкага». Дакументамі і карцінамі, якія размешчаны на 18 стэндах (усяго больш 500 экспанатаў), выстаўка расказвае аб выдатным жыццёвым шляху вялікага пісьменніка аб яго дружбе з геніямі чалавецтва Леніным і Сталіным.

Выстаўка будзе адкрыта ў Беластоку да 12 красавіка.

Сёння-ж у Доме Чырвонай Арміі адбудзецца літаратурны вечар, на якім навуковы супрацоўнік музея А. М. Горкага тав. Левін выступіць з дакладам аб А. М. Горкім.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара — 22 (па камутатару аблвыканкома) і 49 (гарадскі), сакратарыята, партыйнага і савецкага аддзелаў — 23 (па камутатару аблвыканкома), прамысловага, сельскагаспадарчага, культурнага і інфармацыйнага аддзелаў — 17-62 (гарадскі). Тэлефон выдавецтва і аддзела аб'яў — 16-10. Тэлефон друкарні і начной рэдакцыі — 5-21.
Падпіску на газеты прымае «Саюздрук» (Тэлефон 5-14).

Упаўнаважаны абдліта № 443. 1-я дзяржаўная друкарня г. Беластока.